# ПАЛІНДРОМ ЯК ЛІНГВІСТЫЧНАЯ З’ЯВА: ДА ПАСТАНОЎКІ ПЫТАННЯ

**Д. М. Чаранкевіч**
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – Н. П. Лобань, канд. філалаг. навук, дац.*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца паліндром як лінгвістычная з’ява; вызначаецца сутнасць паліндрома, паходжанне тэрміна; акрэсліваюцца разнавіднасці паліндрома, прыводзяцца прыклады.

**Ключавыя словы:** паліндром; слова-паліндром; фраза-паліндром; квазіпаліндром; псеўдапаліндром; рэктус-паліндром; верш-паліндром.

*Паліндром* (грэч. πᾰλίν-δρομος ‘бягу назад’) – гэта звычайна слова або выраз, якія аднолькава чытаюцца як злева направа, так і справа налева: *заказ, наган, Ала* [6, с. 417–418]. Існуюць паліндромы *дакладныя* і *недакладныя*. Абсалютна дакладнымі будуць лічыцца такія, як *мадам*, *казак,* недакладнымі: *нос – сон, кот – ток*. Напрыклад, выраз “*указ а казаку*” – гэта ўжо не зусім дакладны паліндром, таму што яго левая частка графічна адрозніваецца ад правай. Паліндром часам называюць *пярэваратнем*, а прапанаваў так называць паліндром рускі паэт-авангардыст В. Хлебнікаў, які характарызаваў яго як двайное цячэнне маўлення [3].

Паліндромы сустракаюцца ва ўсіх мовах свету. Існуюць яны ў розных формах: імёны (Боб), лічбы (303), спалучэнні некалькіх слоў і нават сказы (*Горад – там шмат дарог*) і інш. Паняцце паліндрома прадстаўлена ў энцыклапедыях, слоўніках і даведніках, дзе паліндром асэнсоўваецца ў тым ліку і як лінгвістычны тэрмін, як моўны выраз, моўны і маўленчы феномен. Мэта артыкула – разгляд паліндрома як лінгвістычнай з’явы, вызначэнне яго сутнасці, разнавіднасцяў.

Вядома, што гісторыя паліндрома сыходзіць у далёкую старажытнасць. Паліндрамічныя вершы былі вядомы яшчэ ў старажытным Кітаі. Многімі даследчыкамі адзначаюцца загаворна-малітоўныя ўласцівасці паліндромаў, якія дазвалялі выкарыстоўваць іх у якасці заклёнаў, якія маглі дапамагчы дабіцца справядлівасці і г. д. Даўнія народныя выразы нярэдка мелі паліндрамічную структуру, звычайна яны валодалі магічным, таямнічым і сакральным адценнем. Так, самы старажытны *суперпаліндром* (*магічны квадрат*), які захаваўся і дайшоў да нашага часу, напісаны на латыні і датуецца IV ст. н. э. Гэта фраза “*Sator Arepo Tenet Opera Rotas*”, што азначае: “Сейбіт Арэпа з цяжкасцю (або ў іншых варыянтах – у працы) трымае колы” [5]. Гэты паліндром размешчаны ў квадрат, дзе ён чытаецца як па радках, так і па слупках, асновай такога квадрата з’яўляецца слова *tenet*, што значыць *трымае.* У Сярэднявечны такому квадрату з паліндромам прыпісвалі магічную сілу:

акрамя ачышчальных якасцяў, Sator Arepo абараняў маёмасць, людзей ад хвароб і ад пажару падчас сну [4].

Паліндромам таксама можна назваць аб'ект, які мае лінейную або цыклічную форму арганізацыі, у якой зададзена сіметрыя суб'ектаў ад пачатку да канца і ад канца да пачатку.

Паліндромы могуць мець форму верша (г. зн. разбівацца на радкі) ці запісвацца ў прозе – лінейна. Аднарадковыя паліндромы не адносяцца ні да верша, ні да прозы.

У навуковай літаратуры вылучаюць *словы-паліндромы, фразы-паліндромы, квазіпаліндромы, псеўдапаліндромы, рэктус-паліндромы, вершы-паліндромы (паліндрамічныя вершы)*. Спынім увагу на гэтых разнавіднасцях паліндрома.

***Слова-паліндром*** – гэта асобнае слова, якое чытаецца аднолькава ў абодвух напрамках: *кок, шалаш, наган*. Да прыкладу, даследчыкі адзначаюць, што самым доўгім паліндромным словам у Оксфардскім слоўніку англійскай мовы з'яўляецца “TATTARRATTAT”, прыдуманае Джэймсам Джойсам у рамане “Уліс”, якое абазначае грук у дзверы. Сюды ж можна аднесці і словы, якія пры чытанні наадварот, ствараюць іншыя словы: *гром – морг, сорт – трос, ікра – аркі, заказ – заказ, радар – радар, шабаш – шабаш.*

***Фраза-паліндром*** – часцей гэта фраза, якая чытаецца аднолькава злева направа і наадварот: *адна банда, худы дух.* Нельга тут не ўзгадаць шырока вядомы паліндром А. Фета “А роза упала на лапу Азора”, які стаў асабліва папулярным пасля яго выкарыстання А. Талстым у казцы “Бураціна”.

***Квазіпаліндром*** – гэта паліндром без уліку мяккага знака, апострафа, у якім таксама магчымы замены “і” на “й”, “ш” на “шч”: *дзедаў ад'езд.*

***Псеўдапаліндром*** – гэта слова або фраза, якія пры чытанні наадварот набываюць іншы сэнс: АркА, АНгіНА і інш. Часта такія словы называюць *паліндромтам* (*паліндранатам*); яны бываюць розных тыпаў.

***Рэктус-паліндром (кругафон)*** – гэта паліндром, слова або тэкст, пры размяшчэнні якога па крузе з розных месцаў па гадзіннай стрэлцы можна прачытаць дзве розныя фразы, напрыклад: рака/кара, горка/кагор, рыкша/шарык, кусай/сайку і інш.

***Верш-паліндром, або паліндрамічны верш*** – адна з графічных форм у паэзіі. Гэта прыём падбору такой слоўнай канструкцыі, якая дапускае адначасова і традыцыйнае ў літаратуры – злева направа, і справа налева чытанне адной і той жа асэнсаванай фразы. Напрыклад, верш Р. Крушыны “Я і лаза і азалія”, які змешчаны ў яго кнізе “Хвіліна роздуму” (1968) і які лічыцца першым паліндромным вершам у беларускай літаратуры:

*Горад. Там шмат дарог.*
*Гонар. Атара ног.*
*Маса. А сам*
*Я аматар. Трата мая –*
*Сачу час.*

*І марамі*
*Я сунуся:*
*Я – і лаза і азалія* [2].

Вершы-паліндромы таксама з лёгкай рукі В. Хлебнікава называюць вершамі для вока, намякаючы на тое, што іх можна аднесці да твора слоўна-выяўленчага мастацтва [3].

Акрамя названых тыпаў паліндромаў, вылучаюць таксама *двухмоўныя паліндромы, лічбавыя паліндромы, літарна-лічбавыя паліндромы,* т. зв. *пантаграмы* і некаторыя інш.

Трэба адзначыць, што паліндром набыў у еўрапейскай літаратуры шырокую папулярнасць яшчэ ў эпоху барока, хоць быў вынайдзены рымскім паэтам Парфір Аптацыянам ў IV ст. н. э. і рэгулярна выкарыстоўваўся ўжо ў тэкстах лацінскага Сярэднявечча.

У сучаснай беларускай паэзіі можна назіраць імкненне некаторых аўтараў (С. Мінскевіч, А. Туровіч, Я. Лайкоў, В. Сахарчук, В. Драздова, А. Трафімчык, Я. Кацатыг, Ф. Богуш і інш.) аб’яднаць у паліндрамічных структурах элементы розумазаключэнняў і зрошчвання слоў, надання тэкстам разнастайнага інтанавання, незвычайнага гучання і г. д. Майстрам сучаснага паліндрома справядліва лічыцца В. Жыбуль.

Можна па рознаму ўспрымаць паліндром: як гульню словам, словамі або як заканамерны выпадак гукавога размеркавання, адно несумненна, што ўдала створаны паліндром робіць маўленне больш насычанам, экспрэсіўным і эмацыянальным.

**Літаратура**


1. Жыбуль, В. Гісторыя і тэорыя паліндрома [Электронны рэсурс] / В. Жыбуль // Беларускі Калегіюм. – Рэжым доступу: https://belcollegium.by/viktar-zhybul-gistoryya-i-teoryya-palindromu/. – Дата доступу: 14.05.2020.
2. Крушына, Р. Я – і лаза і азалія [Электронны рэсурс] / Р. Крушына // Родныя вобразы. – Рэжым доступу: http://rv-blr.com/verse/show/13382. – Дата доступу: 14.05.2020.
3. Палиндром [Электронный ресурс] // Энциклопедия Кругосвет : универсальная научно-популярная энциклопедия. – Режим доступа: https://www.krugosvet.ru/-enc/gumanitarnye_nauki/lingvistika/PALINDROM.html. – Дата доступа: 14.05.2020.
4. Палиндромический стих [Электронный ресурс] // Лингвокультурологический тезаурус “Гуманитарная Россия”. – Режим доступа: http://www.phi-lol.msu.ru/~tezaurus/library.php?view=d&course=4&raz=5&pod=1&par=2. – Дата доступа: 14.05.2020.
5. Палиндромы [Электронный ресурс] // Orator.ru. – Режим доступа: http://www.orator.ru/int_palindromy.html. – Дата доступа: 14.05.2020.
6. Старичёнок, В. Д. Большой лингвистический словарь / В. Д. Старичёнок. – Ростов н/Д : Феникс, 2008. – 811 с.